ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2024 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны" (далей – фестываль).

2. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама (далей - упраўленне); ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; аддзел культуры Гродзенскага гарвыканкама (дадатак 1).

3. Мэтамі і задачамі фестывалю з'яўляюцца: захаванне і папулярызацыя рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай культуры Гродзенскай вобласці; далучэнне шырокай грамадскасці да традыцыйнай культуры рэгіёну; папулярызацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны, розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры; дэманстрацыя рэгіянальных свят і абрадаў, народных касцюмаў; далучэнне да традыцыйнай культуры дзяцей і падлеткаў праз народныя гульні, танцы, а таксама ўсіх жадаючых праз навучанне і майстар-класы ад носьбітаў тэхналогій традыцыйных рамёстваў; паказ магчымасцяў уключэння аб'ектаў нематэрыяльнай культуры ў сучасныя эканамічныя працэсы, інтэграцыі традыцыйнай культуры ў моладзевае асяроддзе.

4. Фестываль адбудзецца 22-23 чэрвеня 2024 года ў г. Гродна.

5. У фестывалі прымаюць удзел лепшыя фальклорныя калектывы Гродзеншчыны, народныя тэатры гульні, майстры народнай творчасці раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, аддзелаў рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, іншыя творчыя калектывы вобласці, а таксама творчыя калектывы і майстры з іншых абласцей Беларусі (па запрашэнні аргкамітэта).

6. Праграма фестывалю ўключае:
- урачыстае адкрыццё;
- конкурс падворкаў сярод раёнаў вобласці;
- конкурс фальклорнага мастацтва;
- канцэрт фальклорных калектываў;
- працу інтэрактыўнай пляцоўкі народных лялечных тэатраў;

- працу інтэрактыўнай пляцоўкі народных строяў Гродзеншчыны, на якой будуць прадстаўлены рэканструяваныя і завершаныя рэплікі традыцыйных строяў усіх раёнаў вобласці;
- працу інтэрактыўнай пляцоўкі з гульнёва-забаўляльнымі праграмамі, на якой прымаюць удзел лепшыя тэатры гульні вобласці;
- працу інтэрактыўнай пляцоўкі па навучанні побытавым танцам, на якой прымаюць удзел фальклорныя калектывы, усе жадаючыя;
- падвядзенне вынікаў, узнагароджванне ўдзельнікаў і пераможцаў фестывалю.

7. Для ўдзелу ў конкурсе падворкаў кожны раён прадстаўляе падворак, які прадугледжвае яго прэзентацыю; майстар-класы па традыцыйных рамёствах; выстаўку-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці; дэгустацыю мясцовых страў, дзе асаблівая ўвага надзяляецца стравам з таркаванай бульбы; прэзентацыю элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а таксама тых элементаў, якія знаходзяцца ў рэгіянальным інвентары на перспектыву.

8. Від і характар рамесніцкіх работ, якія дэманструюцца на фестывалі, не абмяжоўваюцца. Абавязковым патрабаваннем з'яўляецца іх адпаведнасць традыцыям пэўнага віду народнай культуры, народных промыслаў і рамёстваў.

9. Для ўдзелу ў конкурсе фальклорнага мастацтва неабходна да 24 мая 2024 года даслаць на адрас Гродзенскага АМЦНТ (info@gromc.by) заяўку (дадатак 3) і відэаматэрыялы конкурсных нумароў. Аргкамітэт правядзе адбор нумароў (не больш за два) ад кожнага калектыву і паведаміць асобна.

10. Музычнае суправаджэнне конкурсных нумароў ажыццяўляецца толькі пад жывы акампанемент.

11. Выкананне аўтарскіх і апрацаваных твораў не дазваляецца.

12. Касцюмы, абутак, галаўныя ўборы ўдзельнікаў фестывалю павінны адпавядаць варыянтам арыгіналаў народных строяў сваёй мясцовасці.

13. Конкурсы падворкаў праводзіцца па наступных намінацыях:
- "Лепшы падворак традыцыйнай культуры Гродзеншчыны";
- "Лепшая калекцыя работ традыцыйных рамёстваў";
- "Лепшая прэзентацыя традыцыйных страў";
- "Лепшая прэзентацыя падворка традыцыйнай культуры Гродзеншчыны".

14. Конкурсы фальклорнага мастацтва праводзіцца па наступных намінацыях:
- "Лепшы фальклорны танцавальны калектыў";
- "Лепшы фальклорны інструментальны ансамбль";

- “Лепшы дзіцячы фальклорны калектыў”;
- “Лепшы дарослы фальклорны калектыў”.

15. Пераможцаў конкурсу вылучае кампетэнтнае журы (дадатак 2).

16. У кожнай намінацыі журы вылучае лаўрэатаў I, II, III ступені, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі ў рамках і прызамі.

17. Дадаткова журы ўзнагароджвае канкурсантаў таксама спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках:

- “лепшая гульнёва-забаўляльная праграма”;
- “за самабытнасць акцёрскага майстэрства”;
- “за самабытнасць і адметнасць выканальніцкага стылю”;
- “за пераемнасць народных традыцый і інтэграцыю ў моладзевае асяроддзе”;
- “за дзейсную папулярызацыю абрадавых і святочных традыцый Гродзенскага Панямоння”.

18. Усе астатнія ўдзельнікі фестывалю атрымліваюць дыпломы за ўдзел у фестывалі.

19. Журы пакідае за сабой права ў рамках агульнага прызавога фонду аб’ядноўваць, падзяляць прызавыя месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі.

20. Пры падвядзенні вынікаў фестывалю журы ўлічвае:

- рэжысёрскае вырашэнне прэзентацыі падворка;
- рамесніцкае і тэхналагічнае майстэрства, якое адпавядае народным традыцыям;
- захаванне мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;
- валоданне рэгіянальнай манерай выканання;
- узровень выканальніцкага майстэрства.
- эфектыўнасць і выніковасць правядзення майстар-класаў;
- даступнасць і нагляднасць дэманстрацыі тэхналагічных і творчых працэсаў;
- мастацкі ўзровень выставачных гатовых калекцый;
- выкарыстанне народных традыцый, іх тактоўную інтэрпрэтацыю ў адпаведнасці з сучаснымі ўмовамі.

21. Рашэнне членаў журы па выніках фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісываюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарых дзён з дня правядзення фестывалю на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

22. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

23. Дастаўка выставачнага абсталявання, затраты на правядзенне майстар-класаў, дэкаратыўныя матэрыялы для афармлення выставак, камандзіровачныя выдаткі – за кошт накіроўваючай арганізацыі.

24. Фінансаванне выдаткаў Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе

ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

25. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: выраб дыпломаў; работа вядучых; аплата працы і праезда членам журы; арэнда сцэнічнага подыума; прызы, спецыяльныя прызы; рамкі для дыпломаў; паслугі па музычнаму афармленні і гукавому ўзмацненні.

26. Для фінансавання фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

27. Арганізатары фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў выканаўцаў і калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам і калектывам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

| | |
|---|---|
| Куратчык С. В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Гарчычка І.Ю. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Чарняк Д.Р. | начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама; |
| Шлавянец В.Ф. | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Шунейка А.Ф. | метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 2
да інструкцыя аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

| | |
|---|---|
| Сахута Яўген Міхайлавіч | доктар мастацтвазнаўства, прафесар, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, старшыня журы; |
| Клімовіч Алена Віктараўна | начальнік ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня журы; |
| Каліноўская Алена Тадэвушаўна | вядучы спецыяліст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, намеснік старшыні журы; |
| Мазюк Ірына Васільеўна | старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма УА “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, член Беларускага саюза музычных дзеячаў; |
| Мікульчык Алена Мікалаеўна | эксперт беларускай і славянскай кухні, гісторык кулінарыі; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Шлавянец Вольга Францаўна | загадчык аддзела традыцыйнай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
традыцыйнай культуры
"Скарбы Гродзеншчыны"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела
(сектара) культуры
гар(рай)выканкама

## ЗАЯЎКА

на ўдзел у конкурсе фальклору на абласным фестывалі традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны"

1. Раён, установа, якую прадстаўляе калектыў

_______________________________________________

2. Поўная назва калектыву_______________________

_______________________________________________

3. Колькасны склад удзельнікаў калектыву__________

_______________________________________________

4. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву__________

_______________________________________________

5. Спіс твораў, якія будуць прадстаўлены ў конкурснай праграме__________

_______________________________________________

6. Кантактны тэлефон___________________________

Кіраўнік базавай установы

____________________ ____________

*(ініцыялы, прозвішча)* *(подпіс)*